Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2024-11-01

# Складнік культурнага кода

**У Мінску адбыўся круглы стол «Трэнд на роднае: дасягнені навукоўцаў і пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы». Спікеры абмеркавалі дасягненні ў даследаванні роднай мовы, што неабходна зрабіць для яе папулярызацыі і якая роля належыць СМІ, ці ёсць зацікаўленасць у моладзі вывучаць родную мову. Лейтматывам усіх выступленняў стала аксіёма: нацыянальная мова — адзін з найважнейшых складнікаў культурнага кода нацыі.**

Дырэктар філіяла «Інстытут мовазнаўства» імя Якуба Коласа Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Ігар Капылоў нагадаў: сёлета 2 лістапада адзначаецца 95-годдзе з дня ўтварэння філіяла «Інстытут мовазнаўства» імя Якуба Коласа Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

— Патрыятызм — падмурак дзяржавы, таму яна ўдзяляе вялікую ўвагу гістарычнай памяці, пытанням кансалідацыі беларускага грамадства, захаванню традыцыйных духоўных сямейных каштоўнасцей. І ўсё гэта сканцэнтравана менавіта ў слове, — падкрэсліў Ігар Лявонавіч. — Шмат увагі моўнаму аспекту ўдзяляецца ў Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, якая была прынята ў канцы мінулага года. Вядзецца вялікая работа па вяртанні сваёй пісьмовай спадчыны, бо наша нацыя багатая, але мала што з арыгінальных помнікаў захавалася. Сярод іх — знакаміты слоўнік Насовіча, які знаходзіцца ў архіве ў Санкт-Пецярбургу. Гонар нашай нацыі — апублікаваны ў 37 выпусках Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Сёлета, дарэчы, заканчваецца цыкл прац, прысвечаных вывучэнню старабеларускай мовы. Гістарычны і духоўны аспекты таксама важныя. Нацыя сфарміраваная, калі ёсць хоць адзін пераклад Свяшчэннага Пісання на нацыянальную мову. У нас іх 18, а калі лічыць асобныя фрагменты Біблії — і больш.

Дарэчы, 31 кастрычніка — 1 лістапада філіял «Інстытут мовазнаўства» імя Якуба Коласа Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі праводзіць маштабны Міжнародны кангрэс «Беларуская мова — галоўная гісторыка-культурная каштоўнасць нацыі і дзяржавы», у якім бяруць удзел больш за 100 даследчыкаў.

Падчас круглага стала прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар Віктар Іўчанкаў уручыў сваю кнігу «Беларуская арфаграфія ў медыя» Ігару Капылову (ён таксама прычыніўся да яе выхаду ў свет). Гэта выданне паказвае беларускі правапіс у дзеянні. Было падкрэслена, наколькі вялікі ўнёсак у моўную культуру зрабіла прыняцце ў 2008 годзе Закона «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».

Удзел у круглым стале таксама прынялі: кансультант упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ірына Булаўкіна, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Юлія Назаранка, галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова» Наталля Шапран, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Аляксей Чарота, галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» Яніна Каралёва.

**Ірына ПРЫМАК**